*Кухаронак Т.*
*(Беларусь)*

# Сучасны стан і тэндэнцыі развіцця традыцыйнай каляндарнай абраднасці у беларусаў

Погляд на культуру, які лічыцца, безумоўна, сучасным, выцякае з эмпірычна нагляднага факта множнасці культур, іх якаснага адрознення і нацыянальнай своеасаблівасці. Мудрасць нашага часу якраз і заключаецца ў прызнанні за кожнай культурай яе права на самастойнае існаванне і развіццё, у адстойванні прынцыпа раўнапраўнага суіснавання ўсіх культур. Культура па сваёй прыродзе з'яўяецца не маністычнай, а плюралістычнай – такі настрой думак пераважае сёння. У сітуацыі культурнага плюралізма значна ўзрасла цікавасць людзей да нацыянальных асаблівасцей сваёй культуры[1].

Цікавасць да традыцыйнай культуры сёння назіраецца ва ўсім свеце, бо наступленне «масавай культуры», нівеліроўка, стандартызацыя, урбанізацыя выклікаюць у душах неасэнсаваны пратэст і жаданне захаваць свае карані, каб этнас меў будучыню. Як слушна зазначыў вядомы беларускі філосаф У.Конан, «...калі наступае чарговы крызіс быцця і культуры, а ён звычайна прыходзіць на зломе эпохаў, як і сёння, напрыканцы XX стагоддзя, тады зноў і зноў людства хапаецца за свае спрадвечныя карані. Бо нараджаліся, квітнелі і паміралі царствы, імперыі і цывілізацыі, цямнела і ржавела «золата і серабро» афіцыйных каштоўнасцей, а забытая альбо здадзеная ў архіў народная творчасць заставалася вечна-зялёным Сусветным Дрэвам, крыніцаю духоўнага адраджэння нацыі»[2]. Сёння асаблівую актуальнасць набывае паняцце «экалогія культуры», уведзенае Д.С.Ліхачовым, якое абазначае і захаванне культурнага асяроддзя, і актыўную дзейсную памяць пра мінулае, і разуменне нязменнасці разбураных помнікаў і з'яў культуры, і асэнсаванне страшэннай небяспекі забыцця[3].

Гэта вельмі важна для маральнага асяроддзя, выпрацоўкі каштоўнасных арыенціраў, духо, своеасаблівай «аўры», у якой жыве як асобны чалавек, так і ўвесь народ. У багатай культурнай спадчыне народаў свету, у тым ліку і беларусаў, асабліва вялікая роля належыць каляндарным звычаям і абрадам, народным святам, што ўяўляюць сабой складаную грамадскую з'яву. Яны адлюстроўваюць разнастайныя бакі сацыяльна-эканамічнага, этнічнага, гісторыка-культурнага жыцця народаў на розных этапах развіцця і, у першую чаргу, нясуць на сабе этнічную спецыфіку. Этычны, эстэтычны, эмацыянальны дух, закладзены ў беларускіх каляндарных абрадах і звычаях, заўсёды сцвярджаў перамогу дабра над злом, найвялікшую каштоўнасць жыцця чалавека, якое было знітавана з жыццём прыроды і ўсяго Сусвета. Кожнае абрадавае дзеянне, магічны прыем, замова, прыкмета спрыялі захаванню і працягу рода, паляпшэнню дабрабыта, ушанаванню продкаў.

Менавіта гэта традыцыйная каляндарная абраднасць разам з іншымі пра-

© Кухаронак Т., 1999.

явамі народна-побытавай культуры беларусаў на працягу XX стагоддзя з'яўлялася своеасаблівым «палігонам», дзе ў прасторы і часе адбываліся складаныя працэсы, накіраваныя ў значнай ступені на руйнаванне яе глыбіннага фонду, заснаванага як на язычніцкіх, так і на хрысціянскіх традыцыях.

У постсацыялістычнай Рэспубліцы Беларусь пасля атрымання ў пачатку 90-х гадоў нашай дзяржавай юрыдычнай незалежнасці афіцыйныя адносіны ўлады да традыцыйнай народна-побытавай культуры змяніліся ў бок пазітыўных. На дзяржаўным узроўні былі замацаваны старадаўнія нацыянальныя каляндарныя святы нашага народа, акрамя Купалля. У гэты ж час набрала моц чарговая хваля беларускага Адраджэння, што, на думку беларускіх філосафаў, з'яўляецца наогул «спецыфічнай формай развіцця беларускай культуры, калі назіраюцца больш ці менш працяглыя перыяды паскоранага засваення айчыннага і сусветнага духоўнага вопыту..., якія ў гісторыі народа справядліва названы эпохамі нацыянальнага Адраджэння. А пачыналіся яны заўседы з аб'яўлення роднай мовы важнай духоўнай каштоўнасцю. Родная мова выклікала да жыцця іншыя віды і формы нацыянальнай культуры, выконваючы такім чынам праграмную, па сутнасці, культурна-палітычную функцыю»[4]. Сёння ў Беларусі пад уплывам ідэй Адраджэння назіраецца актывізацыя традыцыйнай народна-побытавай культуры ў аўтэнтычных і другасных формах яе бытавання. Жаданне людзей да творчай самарэалізацыі найбольш ярка праяўляецца ў абрадава-святочнай сферы. У сучасны перыяд у Беларусі бытуюць разнастайныя формы правядзення каляндарных святаў, якія праходзяць у агульнадзяржаўным маштабе, у грамадскай сферы ці ў сям'і. І ў кожнай з іх па-рознаму праяўляюцца новыя і традыцыйныя элементы, кожная форма прыцягвае да сябе пэўныя колы насельніцтва, так што ўсе сучасныя беларусы так ці інакш удзельнічаюць у каляндарных святах і абрадах[5].

Найбольшае распаўсюджанне сярод сельскіх і гарадскіх жыхароў Беларусі маюць сёння такія традыцыйныя каляндарныя святы і абрады, як Каляды, Гуканне вясны, Вялікдзень, Радаўніца, Сёмуха, дажынкі, восеньскія кірмашы і фэсты, што ладзяцца на Багача і Пакровы, Дзяды.

Каляды аткрываюць гадавы цыкл каляндарна-аграрных святаў у беларусаў-католікаў з 25 снежня, у праваслаўных беларусаў – з 7 студзеня. Калядныя святы абавязкова ўключаюць у сябе абрадавае пераапрананне і маскаванне ў традыцыйныя калядныя персанажы: казу, дзеда, бабу, бусла, каня, чорта, цыганоў, паненку, афіцэра і г.д.

На пачатку 90-х гадоў гэтым у асноўным займаліся культработнікі рэспублікі і гурт калядоўшчыкаў складваўся з удзельнікаў якога-небудзь фальклорна-этнаграфічнага калектыва, які быў амаль што пры кожным сельскім клубе і раённым ці гарадскім доме культуры. Арганізатары калядавання бралі гатовы сцэнарый з нотамі песень і, вывучыўшы іх, атпраўляліся калядаваць. Мясцовыя калядныя звычаі, песні, маскі, іншыя атрыбуты, пра якія яшчэ добра памяталі старэйшыя жыхары населеных пунктаў, культработнікамі ў многіх выпадках поўнасцю ігнараваліся. І зноў пачалася чарговая «прабуксоўка» з адраджэннем народных святаў. Паступова, дзякуючы вялікай прапагандысцкай працы навукоўцаў рэспублікі. метадыстаў Беларускага Інстытута праблем культуры, абласных навукова-метадычных цэнтраў, культработнікі сталі вывучаць мясцовыя калядныя святы і адраджаць гэтыя элементы пры калядаванні, што адразу знайшло падтрымку ў жыхароў кожнага канкрэтнага населенага пункта. Калядоўшчыкі, як і ў мінулым, атрымліваюць дары ад гаспадароў хаты, куды яны заходзяць і калядаванне заканчваецца вечарынкай.

На другі дзень пасля вячэрне-начнога калядавання дарослых і моладзі, ходзяць калядаваць дзеці, якія пераапранаюцца ў карнавальныя касцюмы «воўка», «зайца», «снягуркі», «сняжынкі», «Чырвонай Шапачкі». Развіццё абрадаў калядавання на сучасным этапе абумоўлівае шырокі ўдзел насельніцтва, гэта значыць, як і раней, усеагульнасць святкавання, яго шматпланавасць і варыятыўнасць.

Беларускія дзяўчаты, як і ў мінулым, напярэдадні шчодрага вечара гадаюць пра свой будучы лёс, але усё гэта здзяйсняецца ў выглядзе святочнага жартоўнага розыгрыша.

Для сучаснай каляднай абраднасці характэрна суіснаванне народна-побытавых і царкоўных элементаў. Многія жыхары рэспублікі ходзяць у час святкавання ў царкву (касцёл), водзяць туды дзяцей, дзе для іх наладжваюцца ёлкі і калядныя прадстаўленні.

У сучасны перыяд выпрацаваўся ўжо даволі ўстойлівы сцэнарый правядзення сучаснага гукання вясны, якое мае ў сабе традыцыйныя элементы, песні, гульні. І на вёсцы, і ў горадзе адабрана адпаведная сімволіка і атрыбутыка, замацаваны персанажы, якія асацыіруюцца з гэтым святам Вясноўка, галінкі вярбы, бярозы і іншых дрэў, птушкі з саломы, паперы, або выпечаныя з цеста, выявы жывёл і прыладаў сельскагаспадарчай працы і інш.

У 90-я гады XX ст., калі Вялікдзень стаў дзяржаўным святам, ён атрымаў шырокае распаўсюджанне на тэрыторыі рэспублікі. Культработнікі, як дзяржаўныя служачыя, пачалі ладзіць на гэтае свята разнастайныя мерапрыемствы, выкарыстоўваючы пры іх правядзенні традыцыйную велікодную і валачобную абраднасць і абрадавыя песні, якія найбольш захаваліся ў паўночна-заходніх і цэнтральных раёнах Беларусі. У многіх беларускіх вёсках сучасны Вялікдзень уключае амаль усе традыцыйныя структурныя элементы святкаванне ў сям'і, наведванне царквы (касцёла), абмен падарункамі і чырвонымі яйкамі паміж хроснікамі і іх хроснымі бацькамі, хаджэнне валачобнікаў.

Пачынаючы з 1996 года, свята дажынак на Беларусі праводзіцца як Рэспубліканскі фестываль-ярмарка працаўнікоў вёскі. Ужо прайшлі тры такія фестывалі ў трох абласцях Беларусі: «Дажынкі-96» у г. Століне Брэсцкай вобласці, «Дажынкі – 97» у г. Масты Гродзенскай вобласці і «Дажынкі – 98» у г. Несвіжы Мінскай вобласці. Свята ўключае ў сябе святочнае шэсце ўсіх удзельнікаў па цэнтральнай вуліцы горада і выхад на цэнтральную плошчу, дзе развіваецца Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь. Наперадзе калоны два юнакі і дзве дзяўчыны ў беларускіх нацыянальных касцюмах нясуць разгорнуты сцяг фестываля-ярмаркі, які ўяўляе сабой светла-зялёнае палотнішча з выявай эмблемы фестываля–залатымі калассямі. На плошчы пасля пазыўных фестываля-ярмаркі пачынаецца ўрачысты мітынг, на якім выступаюць адказныя работнікі Савета міністраў, Адміністрацыі Прэзідэнта РБ, мясцовых аблвыканкамаў і райвыканкамаў. Пасля мітынга адбываецца узнагароджанне лепшых камбайнёраў, шафёраў, пераможцаў спаборніцтва на жніве, уручэнне ім каштоўных падарункаў. Затым пачынаецца канцэрт лепшых фальклорных калектываў рэспублікі. Кожнаму фестывалю «Дажынкі» спадарожнічаюць выставы работ народных умельцаў усіх відаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, кулінарных вырабаў, дзіцячай творчасці. Свята доўжыцца два дні. На другі дзень фальклорныя калектывы раз'язджаюцца па раёну, а ў самім горадзе праводзіцца выстаўка сельскагаспадарчай прадукцыі і тэхнікі, што прымала ўдзел ва ўборцы ўраджаю, урачыстае праходжанне гэтай тэхнікі па вуліцах горада, а таксама дэманструецца старадаўняя сельскагаспадарчая тэхніка і традыцыйныя прылады

працы для ўборкі збожжа. Адначасова ў горадзе працуе паралельна некалькі пляцовак, на якіх ідуць канцэрты прафесійных і самадзейных артыстаў, праводзіцца бяспройгрышная латарэя, ладзяцца народныя гульні і забавы.

Вечарам адбываецца гала-канцэрт, факельнае шэсце або салют, начная дыскатэка для моладзі на аткрытай пляцоўцы.

Аналагічным чынам адраджаюцца на Беларусі і іншыя каляндарныя святы і абрады. Культработнікі ладзяць і паказваюць свята, абапіраючыся на канкрэтны мясцовы фальклорна-этнаграфічны матэрыял, а праз два-тры гады яно паступова ператвараецца ў свята ўсёй вёскі. Паўсюль назіраецца тэндэнцыя страты магічных, прававых момантаў у святах і абрадах і павелічэнне ў іх гульнёва-увесяляльных элементаў. У многіх каляндарных святах і абрадах спалучаюцца народныя і хрысціянскія традыцыі. Асабліва гэта тычыцца Пакроваў, у правядзенні якіх сёння ўдзельнічаюць як культработнікі, так і святары.

У канцы 80-х гадоў да спрадвечных традыцый восеньскіх памінальных дзён праявіла цікавасць моладзь рэспублікі і дзеячы Беларускага народнага фронта «Адраджэнне», якія наладжвалі ў змітраўскую суботу несанкцыяніраваныя мітынгі-рэквіумы ў Курапатах пад Мінскам, на Маскоўскіх могілках у г. Мінску і інш. На думку арганізатараў гэтых мерапрыемстваў, восеньскія Дзяды павінны былі стаць днём гістарычнай памяці аб выдатных продках беларусаў, а таксама аб ахвярах сталінскіх рэпрэсій і гітлераўскіх катаванняў і забойстваў.

У 90-я гады восеньскія Дзяды, прымеркаваныя да 2 лістапада, на некаторы час сталі афіцыйным нерабочым днём і вельмі хутка тысячы беларусаў пачалі ў гэты дзень у сям'і памінаць сваіх продкаў. Сёння восеньскія Дзяды, увабраўшы ў сябе народныя і хрысціянскія традыцыі, шырока бытуюць сярод сельскіх і гарадскіх жыхароў рэспублікі.

Такім чынам, прааналізаваўшы сучасны стан традыцыйнай каляндарнай абраднасці на Беларусі, прыходзім да высновы, што яна паступова дэсакралізуецца, усё большае пашырэнне ў ёй набываюць гульнёва-увесяляльныя элементы. У сучасны перыяд развіваюцца ў асноўным другасныя формы традыцыйнай каляндарнай абраднасці, падрыхтаваныя культработнікамі для спажывання сучасным чалавекам. Разам з тым, Беларусь сёння з'яўляецца адной з нямногіх еўрапейскіх дзяржаў, дзе ў жывым бытаванні сустракаюцца некаторыя каляндарныя святы, абрады, песні, якія разам з іншымі відамі і формамі аўтэнтычнай творчай дзейнасці з'яуляюцца сімвалам нацыянальнай культурнай самабытнасці беларусаў, што ў сваю чаргу выступае рэальным гарантам культурнай разнастайнасці і процівагай уніфікацыі сучаснай сусветнай культуры. Па гэтай прычыне народныя каляндарныя абрады, як і ўвесь аўтэнтычны фальклор, набываюць вартасць гісторыка-культурнай каштоўнасці, якая павінна ахоўвацца ўжо прынятым Законам Рэспублікі Беларусь «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны» і рыхтуемым да прыняцця Законам «Аб ахове і зберажэнні фальклору ў Рэспубліцы Беларусь». Гэта сведчанне таго, што Беларусь як суверэнная еўрапейская дзяржава, не стаіць у баку ад агульнаеўрапейскіх і агульнасусветных прыярытэтаў у адносінах да культурнай спадчыны, якой пагражае знікненне.

Верыцца, што агульнымі намаганнямі мы можам паўплываць на характар еўрапейскай культуры XXI стагоддзя, якая будзе спалучаць у сабе лепшыя традыцыйныя формы, сучасныя дасягненні і пошукі, і імкненне да нязведанай і невядомай будучыні.

[1] *Межуев В.М.* Национальная культура и современная цивилизация // Освобождение духа. – М., 1991. – С. 255.

[2] *Конан У.* Архетыпы нашай культуры // Адукацыя і выхаванне. – 1996. – № 1. – С. 16.

[3] *Лихачев Д.С.* Избранные труды в трех томах. – Т. 2. – Л., 1987. – С. 485.

[4] *Конан У.* Этапы адраджэння // Мастацтва Беларусі. – 1989. – № 1. – С. 2.

[5] Матэрыялы сабраны аўтарам у час экспедыцыйных паездак у разнастайныя рэгіёны Беларусі ў 1989–1998 гг.